Мікалай
Кузьмініч

кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
прарэктар па вучэбнай рабоце
Інстытута культуры Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

# Канцэптуальныя падыходы да ўдасканалення сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у сферы культуры

Дзяржаўная стратэгія па развіцці і эфектыўным выкарыстанні культурнага патэнцыялу краіны, падтрымцы інавацый у сферы культуры прадстаўлена ў Дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі» на 2011—2015 гг., якая накіравана на вырашэнне актуальных праблем культурнага развіцця Рэспублікі. Стратэгічнай мэтай дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры з'яўляецца развіццё і эфектыўнае выкарыстанне культурнага патэнцыялу краіны, падтрымка інавацый, павышэнне сацыяльнай і эканамічнай эфектыўнасці функцыянавання сферы культуры. У краіне існуе разгалінаваная сетка ўстаноў культуры, якая ў значнай ступені забяспечвае даступнасць паслуг культуры для грамадзян Рэспублікі Беларусь [1].



Важнейшай умовай рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы з'яўляецца забеспячэнне галіны высокакваліфікаванымі кадрамі. Атрыманне адукацыі ў сферы культуры забяспечваюць 3 вышэйшыя, 21 сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова, каля 600 дзіцячых школ мастацтваў і іх філіялаў. Створана сістэма дадатковай адукацыі дарослых, якая вырашае задачы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў для сферы культуры.

На сённяшні дзень эфектыўнае функцыянаванне ўстаноў і арганізацый сферы культуры забяспечваюць 46 тыс. спецыялістаў, сярод якіх 46 % маюць вышэйшую, 43 % — сярэднюю спецыяльную адукацыю,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

а 11,1 % працуючых з'яўляюцца практыкамі. Пераважная большасць працаўнікоў устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў культуры мае значны стаж у галіне, і толькі 11,3 % працуюць менш за 3 гады. Дынаміка сацыяльна-культурных працэсаў патрабуе ад іх пастаяннага прафесійнага самаўдасканалення, у тым ліку і праз сістэму дадатковай адукацыі дарослых, якую складаюць установы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў (далей — ПК і ПК) [2].

Павышэнне кваліфікацыі адносіцца да дадатковай адукацыі дарослых і забяспечвае прафесійнае ўдасканаленне, падрыхтоўку да працоўнай дзейнасці ў зменлівых сацыяльна-культурных і эканамічных умовах і на гэтай аснове спрыяе эфектыўнаму развіццю галіны культуры. Акрамя таго, павышэнне кваліфікацыі кадраў — гэта паглыбленне прафесійных ведаў і навыкаў па адпаведных узроўнях атрыманай раней асноўнай адукацыі. Перападрыхтоўка кадраў таксама адносіцца да дадатковай адукацыі дарослых і забяспечвае атрыманне новай кваліфікацыі адпаведнага профілю на ўзроўні вышэйшай адукацыі, задавальняе запатрабаванні працаўнікоў сферы культуры ў прафесійным удасканаленні.



Сістэму ПК і ПК Беларусі ўтвараюць Інстытут культуры Беларусі, факультэты ПК і ПК ВНУ, абласныя курсы і некаторыя іншыя формы дадатковай адукацыі дарослых. Яны забяспечваюць галіну высокакваліфікаванымі кадрамі. У іх дзейнасці актуальнымі з'яўляюцца ідэі: апераджальнага навучання кіраўнікоў і спецыялістаў з арыентацыяй на далейшае развіццё іх прафесійных ведаў і навыкаў; актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў з павелічэннем долі іх самастойнай працы; рэалізацыі кампетэнтнага падыходу ў навучанні і пераадолення прадметнай мадэлі падрыхтоўкі спецыяліста; надання працэсу навучання практыкаарыентаванага зместу.

Разам з тым, сістэма ПК і ПК у сферы культуры мае шэраг недахопаў, які перашкаджае ў поўнай меры рашыць задачы кадравага забеспячэння галіны. Існуе характэрная для ўсёй прафесійнай адукацыйнай сферы супярэчнасць паміж зместам вучэбных курсаў і патрабаваннямі сучаснай практыкі ў засваенні новых тэхналогій. У сферы культуры ва ўмовах рынкавых адносін і прававога ўдасканалення дзейнасці перманентна змяняюцца «правілы гульні», у той час як у адукацыі захоўваецца назапашвальна-кансерватыўная мадэль набыцця ведаў. Да недахопаў існуючай сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі таксама можна аднесці наступнае: недастатковы ўзровень рэагавання на змены ў сацыякультурнай прасторы, трансфармацыю сацыяльна-эканамічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

умоў, прагрэс у навуцы і тэхналогіях; прыярытэт у змесце вучэбных курсаў фундаментальных ведаў і недаацэнка практыкаарыентаваных ведаў і навыкаў; ігнараванне сучасных адукацыйных тэхналогій і залішні кансерватызм у арганізацыі вучэбнага працэсу; адсутнасць навукова-абгрунтаванай сістэмы патрабаванняў да перыядычнасці, працягласці і задач павышэння кваліфікацыі; недастатковая ўзаемасувязь устаноў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі з профільнымі ўстановамі адукацыі і ўстановамі сацыякультурнай сферы.

Важнейшымі з'яўляюцца праблемы: павышэнне кампетэнтнасці прафесарска-выкладчыцкага складу і кіраўнікоў сістэмы адукацыі дарослых; правядзенне маніторынгу слухачоў і стажораў з мэтай вызначэння ахопу спецыялістаў дзяржаўных і ведамасных устаноў культуры, вывучэння перыядычнасці павышэння іх кваліфікацыі і вызначэння кірункаў такой працы; узаемадзеянне ўстаноў ПК і ПК з вядучымі навукова-метадычнымі цэнтрамі галіны; каардынацыя дзейнасці абласных курсаў і факультэтаў ПК і ПК ВНУ, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, Інстытута культуры Беларусі; арганізацыя ПК і ПК ва ўмовах рынкавай эканомікі, максімальнага забеспячэння самаакупнасці форм ПК і ПК; пашырэнне пераліку адукацыйных паслуг у сістэме ПК і ПК; папаўненне пазабюджэтных фондаў устаноў ПК і ПК за кошт адкрыцця новых спецыяльнасцей, актыўнага міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы ПК і ПК — абмен вопытам, правядзенне майстар-класаў, праца з замежнымі слухачамі, стажорамі і інш.



Шырыня і важнасць пералічаных праблем патрабуюць усебаковага і комплекснага падыходу да іх аналізу і рашэння, гэта магчыма ў рамках распрацоўкі адпаведных канцэптуальных падыходаў і праграмы па іх рэалізацыі.

Мэтай такой праграмы магло бы стаць стварэнне неабходных умоў для ўдасканалення сістэмы ПК і ПК у сферы культуры Беларусі. Дасягненне дадзенай мэты, на наш погляд, магчыма пры рэалізацыі наступных мерапрыемстваў: распрацоўцы мадэлі ПК і ПК у галіне культуры (прынцыпаў, метадалагічнай асновы, нарматыўнай прававой базы, сістэмы ацэнкі якасці); укараненні інавацыйных тэхналогій у вучэбны працэс Інстытута культуры Беларусі, факультэтаў ПК і ПК ВНУ, абласных курсаў (кампетэнтных мадэлей падрыхтоўкі спецыялістаў і адукацыйных стандартаў); распрацоўцы сістэмы кампетэнцый прафесарска-выкладчыцкага складу, кіраўнікоў і супрацоўнікаў устаноў адукацыі, якія ажыццяўляюць ПК і ПК; стварэнні ўмоў і распрацоўцы сістэмы матывацыі развіцця інавацыйных працэсаў у сферы ПК і ПК галіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працу па рэалізацыі праграмы мерапрыемстваў, накіраваных на ўдасканаленне сістэмы ПК і ПК сферы культуры, мэтазгодна ажыццяўляць па наступных кірунках, якія традыцыйна вылучаюцца пры распрацоўцы праграм рэалізацыі адукацыйных праектаў:

1) удасканаленне нарматыўнай прававой базы функцыянавання сістэмы ПК і ПК галіны (інвентарызацыя нарматыўнай базы існуючай сістэмы ПК і ПК галіны; унясенне змен і дапаўненняў у існуючую вучэбна-метадычную дакументацыю, якая рэгулюе адукацыйную дзейнасць; распрацоўка інструктыўных і іншых дакументаў, якія забяспечваюць пераход сістэмы адукацыі на інавацыйную мадэль, што адпавядае сучасным патрабаванням да кадравага забеспячэння развіцця галіны; распрацоўка прынцыпаў ацэнкі эфектыўнасці функцыянавання сістэмы ПК і ПК галіны);

2) распрацоўка метадалогіі, структуры, зместу, матэрыяльна-тэхнічнага і вучэбна-метадычнага забеспячэння ПК і ПК галіны (правядзенне маніторынгу стану сістэмы ПК і ПК галіны з мэтай фарміравання сучаснай мадэлі сістэмы ПК і ПК, шляхоў яе эфектыўнага функцыянавання; фарміраванне варыятыўнай мадэлі ПК і ПК для галіны ва ўмовах рынкавай эканомікі; аптымізацыя наменклатуры спецыяльнасцей па відах ПК і ПК і ўстановах адукацыі галіны, удакладненне пераліку кваліфікацыйных патрабаванняў да спецыялістаў; распрацоўка вучэбна-метадычных дапаможнікаў, падручнікаў і іншых вучэбных матэрыялаў для арганізацыі адукацыйнага працэсу ў сістэме ПК і ПК на аснове новых адукацыйных тэхналогій; удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, выкарыстанне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры, якія з'яўляюцца навукова-метадычнымі цэнтрамі (вядучыя бібліятэкі, клубныя ўстановы, музеі, установы адукацыі і інш.); пашырэнне міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне ПК і ПК);

3) распрацоўка новых і адаптацыя існуючых адукацыйных тэхналогій для інавацыйнай мадэлі ПК і ПК (распрацоўка механізма выкарыстання патэнцыялу Інстытута культуры Беларусі і ВНУ сферы культуры, навукова-метадычных цэнтраў культуры, вядучых спецыялістаў галіны для фарміравання і рэалізацыі кампетэнтных мадэлей ПК і ПК і арганізацыі інавацыйнага працэсу навучання; распрацоўка сістэмы кампетэнцый прафесарска-выкладчыцкага складу Інстытута культуры Беларусі для рэалізацыі інавацыйнай мадэлі ПК і ПК; стварэнне ўмоў і прынцыпаў інтэгравання адукацыйных працэсаў у сістэме ПК і ПК і сацыякультурных тэхналогій);



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) умацаванне сістэмы ПК і ПК галіны высокакваліфікаванымі кадрамі (увядзенне сістэмы атэстацыі прафесарска-выкладчыцкага складу Інстытута культуры Беларусі з улікам патрабаванняў інавацыйнага развіцця сферы культуры; стварэнне сістэмы маніторынгу рынку працы спецыялістаў, якія працуюць у інавацыйнай сферы галіны культуры).

Рэалізацыя прапанаваных мерапрыемстваў праграмы дазволіць, на наш погляд, распрацаваць нарматыўную прававую базу забеспячэння інавацыйнай мадэлі адукацыі ў сферы ПК і ПК; прывесці ў адпаведнасць з Кодэксам аб адукацыі і іншымі дзяржаўнымі нарматыўна-прававымі актамі вучэбна-метадычную дакументацыю, якая рэгулюе дзейнасць сістэмы ПК і ПК галіны культуры; арганізаваць адукацыйны працэс у Інстытуце культуры Беларусі на аснове сучасных тэхналогій і патрабаванняў галіны; сфарміраваць рэальную сістэму прыярытэтаў развіцця інфраструктуры, вучэбна-навуковай і эканамічнай баз сістэмы ПК і ПК.

Асобая роля ў сістэме ПК і ПК у сферы культуры належыць Інстытуту культуры Беларусі, адукацыйную дзейнасць якога, на наш погляд, варта суадносіць з крытэрыямі ацэнкі адпаведнасці статусу вядучай установы адукацыі дарослых у галіне [3]. Згодна з гэтым крытэрыям Інстытут культуры Беларусі павінен адпавядаць статусу вядучай установы дадатковай адукацыі дарослых па 11-і крытэрыях. Сярод іх такія, як



• рэалізацыя разнастайных адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых (павышэнне кваліфікацыі, перападрыхтоўка вядучых працаўнікоў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю; перападрыхтоўка, прафесійная падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі служачых);

• выкананне планавага паказчыка сярэднегадавой колькасці слухачоў і стажораў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых;

• наяўнасць высокакваліфікаванага кадравага патэнцыялу (патрабуемы працэнт прафесарска-выкладчыцкага складу з навуковай ступенню і (або) вучоным званнем; працэнт прафесарска-выкладчыцкага складу, які працуе на сталай аснове; працэнт выкладчыкаў, што прайшлі павышэнне кваліфікацыі за апошнія 5 гадоў);

• сучаснае інфармацыйнае забеспячэнне (наяўнасць бібліятэкі і чытальнай залы з пэўнай колькасцю месцаў; адпаведная колькасць навуковай і вучэбнай літаратуры ў бібліятэцы; наяўнасць пэўнай колькасці падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, вучэбна-метадычных матэрыялаў і кантрольных заданняў па кожнай вучэбнай дысцыпліне;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

доступ да электронных крыніц інфармацыі; магчымасць тыражыравання вучэбных матэрыялаў для навучэнцаў);

• развітая матэрыяльная база (наяўнасць філіяла Інстытута, кабінетаў, навукова-даследчай часткі (сектары, аддзелы), выдавецкага цэнтра (аддзела);

• дапаможная і аздараўленчая база (інтэрнат, пункт харчавання, медыцынскі пункт);

• ажыццяўленне навуковай і інавацыйнай дзейнасці (наяўнасць навуковых даследаванняў у адпаведнасці з дзяржаўнымі праграмамі фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў, наяўнасць перспектыўнай праграмы навуковых даследаванняў і іх фінансаванне са сродкаў Інстытута, укараненне ў практыку вынікаў фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў у сферы дадатковай адукацыі дарослых);

• поспехі ў ажыццяўленні навуковай (навукова-метадычнай) і інавацыйнай дзейнасці за апошнія 3 гады (выданне зборнікаў навуковых прац, публікацыя манаграфій, выданне падручнікаў, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, навуковага часопіса або іншай перыядычнай навуковай літаратуры);

• ажыццяўленне міжнароднай дзейнасці (удзел у працы замежных і міжнародных арганізацый у сферы дадатковай адукацыі дарослых, а таксама ў міжнародных адукацыйных, культурных, навуковых праграмах і праектах; дадатковая адукацыя замежных грамадзян, абмен з замежнымі ўстановамі адукацыі выкладчыкамі, стажорамі і слухачамі; арганізацыя і правядзенне міжнародных канферэнцый; наяўнасць дамоў з арганізацыямі замежных дзяржаў аб сумеснай дзейнасці ў сферы адукацыі);

• сертыфікацыя сістэмы менеджменту якасці ўстановы дадатковай адукацыі дарослых;

• планаванне дзейнасці ўстановы дадатковай адукацыі дарослых (наяўнасць праграмы развіцця Інстытута, комплекснага плана па ўзаемадзеянню з дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) у пытаннях павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў галіны на бягучы 5-гадовы перыяд, планаў-графікаў па павышэнню кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кадраў галіны на бягучы 5-гадовы перыяд).

Адпаведнасць Інстытута культуры Беларусі статусу вядучай установы адукацыі ў галіне культуры ў сферы дадатковай адукацыі дарослых, наяўнасць шэрага ўстаноў, якія ажыццяўляюць падобную дзейнасць, вымагаюць стварэнню Вучэбна-метадычнага аб’яднання (ВМА) галіны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на базе Інстытута культуры Беларусі з мэтай удасканалення навукова-метадычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых. Дзейнасць ВМА рэгулюецца Палажэннем аб вучэбна-метадычным аб'яднанні ў сферы дадатковай адукацыі дарослых, якое зацверджана Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 195 ад 28 ліпеня 2011 г. [4].

Рэалізацыя прапанаваных мерапрыемстваў дазволіць, на наш погляд, павысіць сацыяльную і эканамічную эфектыўнасць функцыянавання сістэмы дадатковай адукацыі дарослых галіны, будзе садзейнічаць рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011—2015 гг. у плане ўдасканалення кадравага забеспячэння сацыяльна-культурнай сферы, максімальна выкарыстаць патэнцыяльныя магчымасці ўстаноў, якія забяспечваюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў з улікам сучаснай сацыякультурнай і эканамічнай сітуацыі ў краіне.

*Спіс выкарыстаных крыніц*

1. Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2011—2015 гады : пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 26 снеж. 2010 г., № 1905 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. — 2011. — № 11. — 5/33091.

2. Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2010 / І. В. Анціпенка [і інш.] ; пад агул. рэд. Т. І. Стружэцкага ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі. — Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2011. — С. 84—85.

3. Положение о порядке признания учреждения дополнительного образования взрослых ведущим учреждением образования в отрасли : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 15 июля 2011 г., № 954 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. — 2011. — № 86. — 5/34189.

4. Положение об учебно-методическом объединении в сфере дополнительного образования взрослых (утверждено Постановлением Министерства образования Республики Беларусь 28.07.2011 № 195).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ